# ПРАТАКОЛ ПАСЯДЖЭННЯ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ

23 красавіка 2024 года

На пасяджэнні камісіі прысутнічаюць: Андрэй Атаманчук, Алена Філатава, Яраслаў Бекіш, Алена Прыходзька.

У сілу п. 4.11 Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную Раду для прыняцця рашэнняў неабходны кворум павінен складаць 2/3 ад колькасці чальцоў Выбарчай камісіі. Неабходная колькасць сябраў Выбарчай камісіі прысутнічае – 4 чалавекі. Кворум выкананы.

Паседжанне Выбарчай камісіі аб'яўляецца адкрытым.

На пасяджэнні Выбарчай камісіі прысутнічаюць сябры Выбарчай камісіі з правам голасу, а таксама сябры сакратарыята Выбарчай камісіі, якія з'яўляюцца непублічнымі асобамі, аказваюць тэхнічную дапамогу Выбарчай камісіі, у тым ліку складаюць пратакол пасяджэння Выбарчай камісіі, аднак правам галасы не валодаюць.

**Парадак дня:**

1. Зацвярджэнне парадку дня пасяджэння Выбарчай камісіі на 23 красавіка 2024 года.
2. Абвяшчэнне колькасці паступіўшых спісаў.
3. Магчымасць дапускаць да выбараў у працоўным парадку.
4. Аценка крытэру грамадзянства чальцоў спіса.
5. Прынякцце рашэння па спісе “За годнасць беларусак”.

**Разгляд пытання №1.**
Зацвярджэнне парадку дня пасяджэння Выбарчай камісіі на 23 красавіка 2024 года.
Заўваг ад сяброў выбарчай камісіі не паступіла.
Па пытанні № 1 прагаласавалі:
"За" - 4 галасы, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Зацвердзіць парадак дня пасяджэння Выбарчай камісіі на 23 красавіка 2024 года.

**Разгляд пытання №2.**
СЛУХАЛІ: Старшыня Выбарчай камісіі Алена Прыходзька абвясціла колькасць паступиўшых спісаў, якія паступілі ў Выбарчую камісію:

“Учора 22 красавіка а 23 гадзіне 59 хвіліне мы спынілі прыём выбарчых спісаў і станам на бягучы час у нас паступіла 13 выбарчых спісаў. За учора ў нас паступілі наступныя спісы: каманда Латушкі і рух “За свабоду”, блок Пракоп’ева-Ягорава (лідар і ініцыятар спіса Павел Патапаў), спіс “Еўрапейскі выбар” (ініцыятар Аляксандр Дабравольскі), спіс “Воля” (ініцыятар Вадзім Кабанчук), спіс “Наша справа” (ініцыятар Роза Турарбекава), спіс “За годнасць беларусак” (ініцыятар Яраслава Грыгор’еў), спіс “Моладзевы наступ” (Лізавета Пракопчык), спіс “Голас дыяспар. Адзінства па над межамі” (лідар спіса Надзея Нортан, ініцыятар Раман Кісляк), спіс “Хопіць баяцца” (ініцыятар Таццяна Мартынава).”

Усе сябры выбарчай камісіі пацвердзілі, што атрымалі гэтыя спісы.

СЛУХАЛІ: Старшыня Выбарчай камісіі Алена Прыходзька абвясціла колькасць паступіўшых спісаў, якія паступілі ў Выбарчую камісію:

“Спісы знаходзяцца на рознай стадыі апрацоўкі. Спачатку я расскажу аб тым, якія спісы паступілі ў нас адразу. Гэта спіс “Салідарнасць” (Георгій Дзмітрук), спіс “Закон і правапарадак” (Аляксандр Азараў), спіс “Незалежныя беларусы” (Максім Шабуцкі) і спіс “Краіна для жыцця” (Віталь Савюк). Гэтыя спісы ўжо знаходзяцца на фінальнай стадыі апрацоўкі, то-бок чальцы спісаў праходзяць выбарачна асабістую ідэнтыфікацыю праз асабістую сувязь з чальцамі выбарчай камісіі. Гэта значыць, што калі гэта ідэнтыфікацыя адбудзецца і калі ніякіх пытанняў па ёй не ўзнікне, пасутнасці можна сказаць, што гэтыя спісы ўжо прайшлі ўсю апрацоўку.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Яраслава Бекіша па пытанні паступіўшых спісаў:

“Спіс Шабуцькага і Азарава ідэвідуальную выбарчую веріфікацыю прайшлі.”

СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні паступіўшых спісаў у Выбарчую камісію:

“Дзякуй. Гэта вельмі істотны дадатак. То-бок мы можам лічыць, што гэтыя спісы прайшлі праверку. Што тычыцца спісаў, якія паступілі да нас учора, папярэдня ўжо апрацаваны сакратарамі нашай камісіі і ініцыятарам гэтых спісаў учора былі накіраваны лісты аб пацверджанні. Сёння ўсім, апроч аднаго спіса які мы будзем разглядаць, былі накіраваны індывыдуальныя ідэнтыфікацыйныя коды. Гэта значыць, што по ўсім спісам былі прэдастаўлены ўсе неабходныя дакументы, апроч “За годнасць беларусак” і ўсе спісі адпавядаюць гендэрнай квоце.”

**Разгляд пытання №3.**
СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні магчымасці допуска да выбараў у працоўным парадку:

"У нас ёсць спісы, якія цалкам прайшлі ўсе праверкі і спісы, якія цягам дня гэтую праверку скончаць. І каб не чакаць наступнага адкрытага пасяджэння прашу чальцоў каміссіі прагаласаваць, каб мы рашэнні па гэтых і наступных спісах прыймаць у працоўным парадку, а на наступных пасяджэннях проста абвяшчаць аб прынятых рашэннях."

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Яраслава Бекіша па пытанні магчымасці допуска да выбараў у працоўным парадку:

"Калі спісы будуць выклікаць пытанні такія, як сёняшні адзін з іх, то будзем разглядаць у эпіры, каб быць максімальна празрыстымі. Калі пытанняў ня будзе, то лепей прымаць рашэнні ў працоўным парадку."

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Алену Філатаву па пытанні магчымасці допуска да выбараў у працоўным парадку:

"Падтрымліваю. Часу у нас не вельмі шмат, апрацы шмат наадварот і каб не зацягваць гэтыя працэсы."

Галасаванне па пытанні допуска да выбараў у працоўным парадку, не на паседжаннях выбарчай камісіі.

Па пытанні № 3 прагаласавалі:
"За" - 4 галасы, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Зацвердзіць магчымасць допуска да выбараў у працоўным парадку, а не толькі на паседжаннях выбарчай камісіі.

**Разгляд пытання №4.**
СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні ацэнкі крытэру грамадзянства чальцоў спіса:

"Гэта чулліваe пытанне. У Палажэнні аб выбарах прапісана, что ўдзельнікам спіса і ініцыятарам спіса абавязкова павінен быць грамадзянін Рэспублікі Беларусь. Зараз грамадзяне Беларусі знаходзяцца ў розных сітуацыях. Напрыклад, пратэрміноўка пашпарта, ў розных палітычных умовах. Паўставалі пытанні. Каміссія абмеркавала гэта пытанне. Да якіх высноў мы прыйшлі. Грамадзянства – гэта важны фактар. Калі грамадзянін Беларусі мае

пашпарт з пратэрміноўкай пасля 2020 года, то гэты дакумэнт мы прымаем і гэтую пратэрміноўку мы лічым прымальнай. Таксама прымальнай мы лічым, што грамадзянін Рэспублікі Беларусь можа мець грамадзянства іншай краіны, калі ў яго ёсць пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, то мы адштурхоўваемся ад гэтай акалічнасці. Альбо чалавек прадастаўляе іншы дакумент. Літоўскі ці польскі – гэта то з чым мы сутыкаемся, але ў гэтых дакумэнтах пазначана грамадзянства асобы. Такія дакументы мы таксама лічым прымальнымі. Гэта ўсё тычыцца чальцоў выбаршчых спісаў, а не выбаршчыкаў.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Яраслава Бекіша па пытанні ацэнкі крытэру грамадзянства чальцоў спіса:

“Нам прыходзіцца працаваць з разнымі тыпамі дакумэнтаў. Сягодняшні кейс, амерыканскі ID і мы будзем адштурхоўвацца ад тахо ці там пазначана беларускае грамадзянства, не проста імя, прозвішча, асабістыя дадзеныя, а менявіта наяўнасць грамадзянства.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Алену Філатаву па пытанні ацэнкі крытэру грамадзянства чальцоў спіса:

“Мы можам запатрабаваць дадатковыя звесткі каб ідэнтыфікаваць чалавека.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Андрэя Атаманчука па пытанні ацэнкі крытэру грамадзянства чальцоў спіса:

“Грамадзянства – гэта статус. Калі ў нас няма звестак, якія могуць пацвердзіць выхад з грамадзянства, то мы лічым чалавека грамадзянінам Беларусі. Для гэтага патрэбны пацвярджальныя дакументы. Калі чалавек легалізаваўся ў іншай дзяржаве, то ў яго ёсць ВНЖ, дзе будзе ўказана грамадзянства.”

Галасаванне па пытанні разглядаць асобным рашэннем камісіі пытанне наяўнасці грамадзянства Беларусі по спрэчным цяжкім выпадкам.

Па пытанні № 4 прагаласавалі:
"За" - 4 галасы, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Зацвердзіць магчымасць разглядаць асобным рашэннем камісіі пытанне наяўнасці грамадзянства Беларусі по спрэчным цяжкім выпадкам.

**Разгляд пытання №5.**
СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні прыняцця рашэння па спісе “За годнасць беларусак”:

“Да нас паступіў спіс Яраслава Грыгор’ева “За годнасць беларусак”. У гэтым спісе ёсць цікавыя акалічнасці. У спісе імёны пазначаны так, што цяжка зразумець жанчына гэта ці мужчына. Але пазначана, што гэтыя апобы з’яўляюцца жанчынамі. Таму тут ёсць пытання да гэндарнай квоты, якую мы не можам вызначыць. Я прапаную звярнуцца да ініцыятара спіса Яраслава Грыгор’ева, які ў спісе пазначаны як Яраслава. Каб запытаць дадатковыя звесткі. У гэтым спісе пазначана, што ўдзельнічае рух. Тады трэба даслаць адпаведнае рашэнне. І яшчэ у гэтым спісе не зразумела грамадзянства лідара гэтага спіса. Пазначана, што ён грамадзянін іншай краіны. Прапаную даслаць запыт да Яраслава Грыгор’ева.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Яраслава Бекіша па пытанні прыняцця рашэння па спісе “За годнасць беларусак”:

“Не наша справа разбірацца ў матывах заяўнікоў спісу чаму яны так зрабілі. Наша справа – высветліць ці усе 10 асобаў яўляюцца грамадзянамі Беларусі, мы павінны праверыць гендарную квоту.”

СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні прыняцця рашэння па спісе “За годнасць беларусак”:

“Калі была змена гендара, то мы гэта заліцым, але нам патрэбныя да гэтага дакументы.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Алену Філатаву па пытанні прыняцця рашэння па спісе “За годнасць беларусак”:

“Выбарчая камісія дзейнічае на подскаве шматлікіх дакумэнтаў, наша справа строга рэгламентавана і ёсцб пэўныя патрабаванні да дакументаў і гэтага трэба прытрімлівацца.”

Галасаванне па пытанні прыняцця рашэння па спісе “За годнасць беларусак”, накіраваць да спадара/спадарыні спіса Яраслава/Яраславы Грыгор’ева запыт на дадатковыя звесткі па пытаннях, якія для камісіі не зразумелыя.

Па пытанні № 4 прагаласавалі:
"За" - 4 галасы, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Зацвердзіць рашэнне накіраваць да спадара/спадарыні спіса “За годнасць беларусак” Яраслава/Яраславы Грыгор’ева запыт на дадатковыя звесткі па пытаннях, якія для камісіі не зразумелыя.

Паседжанне абвешчана закрытым.